# НавіНЫ

БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТУ "АДРАДЖЭНЬНЕ"

нумар 9 (26) верасень 2000 г.

# БАЙКОТ — 2000




## *МЕНСК*

У Менску з 15.30 да 17.00 на вуліцы Грыцаўца (непадалёк ад Трактарнага заводу) адбыўся пікет, які праводзілі актывісты аб'яднанай апазыцыі. Удзельнікі стаялі ля расьцяжак "Байкот - 2000" і "Сустрэча з выбарнікамі". Мінакам раздавалі спэцвыпускі газэтаў "Наша свабода" й "Народная воля". На гэты раз улады не адважыліся затрымліваць удзельнікаў пікету: магчыма, пабаяліся назіральнікаў ад АБСЭ, што стаялі побач. Тым ня менш, перашкодзіць спрабавалі: спачатку адзін зь міліцыянтаў патрабаваў паказаць арыгінал паведамленьня аб сустрэчы з выбарнікамі, добра ведаючы, што гэты арыгінал ляжыць там, куды яго і дасылалі - у РАУСе; а потым загадалі адвязаць расьцяжкі ад дрэваў - маўляў, гэта антысанітарыя. Пікет, аднак, працягваўся. На месцы сустрэчы сабраўся імправізаваны мітынг, удзельнікамі якога сталі рабочыя Трактарнага заводу, што ішлі з працоўнай зьмены.

* * *

Чарговы пікет - сустрэча з выбарнікамі - у Менску адбыўся 25 верасьня каля станцыі мэтро Ўсход.

За тым, як ідзе сустрэча, назіралі прадстаўнікі АБСЭ.

Удзельнікі пікету прапаноўвалі выбарнікам пазнаёміцца з дэмакратычнымі газэтамі, што асьвятляюць аб'ектыўнае становішча выбараў : "Народная воля", "Рабочы", "Наша свабода". Ужо ад самага пачатку, а 16 гадзіне, зьявіліся "назіральнікі" і зь іншага боку. Людзі ў цывільным здымалі сустрэчу з выбарнікамі на камэру. Тых, хто распаўсюджваў газэты, яны, надзіў, не чапалі, але напрыканцы пікету адзін зь міліцыянтаў "запрасіў" арганізатараў сустрэчы з выбарнікамі на 26 верасьня ў аддзяленьне РАУС.

## *ЛІДА*

Газэта "Голас Ліды", як і плянавалася, выйшла ў аўторак, 19 верасьня. Выпуск не цалкам прысьвечана акцыі "Байкот--2000". 19 числа амаль увесь наклад газэты быў распаўсюджаны.

У газэце пададзена франтаўская інфармацыя, аспэкты мясцовай передвыбарчай агітацыі. Дарэчы, слова «байкот» нават не ўзгадваецца. Затое ёсьць цытаты Лукашэнкі 1995 г., кшталту: "Не надо ходить ни на какие выборы".

Ёсьць рашэньне Лідзкай гарадзкой рады аб правядзеньні мітынгу 8 кастрычніка.

* * *

Другі нумар газэты "Голас Ліды" таксама хутка выйдзе ў сьвет. Ён прысьвечаны байкоту выбараў.

У Лідзе пачынае дзейнічаць клюб выбарнікаў. У гэтую арганізацыю ўваходзяць прадстаўнікі розных рухаў, якія ўжо прайшлі сэмінары па назіраньню за выбарамі. Мэта клюбу - ведаць рэальную інфармацыю аб тым, як пройдуць "выбары" 15 кастрычніка.

## *ГОРАДНЯ*

Горадня таксама падтрымала акцыю "Байкот--2000". Сябры БНФ выдалі свае ўлёткі "Моладзь за Беларусь".

БНФ і МФ плянуюць правесьці шэраг пікетаў, якія дапамогуць акцыі "Байкот--2000" агарнуць яшчэ больш людзей.

## *МАГІЛЁЎ*

4 віды ўлётак, прысьвечаныя байкоту выбараў, падрыхтаваныя Магілёўскай арганізацыяй БНФ.

У першай ўлётцы растлумачана, што такое "Байкот--2000". Другая называецца: "Выборы в палату - обман народа". Дзьве апошнія асьвятляюць "Кто лезет в палату" і каму патрэбныя

*працяг на стар. 2*

vytoki.net

Пачатак на стар. 1

# БАЙКОТ — 2000

такія выбары.

У Магілёве плянуецца шэраг акцыяў.

8 кастрычніка а 12.00 сябры БНФ зьбіраюцца правесьці шырокую сустрэчу з выбарнікамі. Адпаведная заяўка была пададзена кіраўніцтвам Магілёўскай гарадзкой арганізацыяй БНФ 22 верасьня. Паводле меркаваньняў арганізатараў, колькасьць удзельнікаў мітынгу будзе каля 300 чалавек.

У той жа дзень, 8 кастрычніка, а 19.00 у Катэдральным касьцёле адбудзецца спэцыяльная імша - за Беларусь.

* * *

У апошнія некалькі дзён у Магілёве сумеснымі намаганьнямі дэмакратычных арганізацыяў праведзены шэраг мерапрыемстваў у рамках акцыі "Байкот-2000". Падчас іх жыхарам гораду раздаваліся матэрыялы адпаведнага зьместу, вяліся тлумачальныя гутаркі з зацікаўленымі. Найбольш буйныя акцыі мінулых дзён: сустрэча сяброў АГП з выбарнікамі на Менскім рынку й стадыёне "Спартак", распаўсюджваньне ўлётак на шматлюдных прыпынках грамадзкага транспарту, агітацыйны рэйд на Задняпроўскі рынак сяброў БНФ.

Апошняя акцыя адзначылася тым, што адміністрацыя рынку спрабавала затрымаць старшыню абласной Рады БНФ Анатоля Фёдарава, які зьвяртаўся да наведвальнікаў праз мэгафон. Урэшце, супрацоўнікамі міліцыі быў затрыманы распаўсюднік спэцвыпуску газэты "Рабочы" А. Дзьвігун. Разам зь ім затрымалі старшыню гарадзкой Рады БНФ В. Макаранку, які меў значак з надпісам "Байкот-2000". Праз некаторы час В. Макаранку выпусьцілі, бо пры ім не было ніякіх агітацыйных матэрыялаў, а сп. Дзьвігун быў дастаўлены ў Кастрычніцкі РАУС. Там на яго склалі пратакол паводле артыкулу, які прадугледжвае адказнасьць за заклік да байкоту выбараў.

### ГОМЕЛЬ

21 верасьня Анатоль Паплаўны, старшыня Гомельскай гарадзкой арганізацыі БНФ, быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі ў сваёй машыне. Учыніўшыператрус, міліцыянты знайшлі ў багажніку спэцвыпуск газэты "Рабочы". Газэту канфіскавалі, а старшыню гарадзкой арганізацыі завезьлі ў РАУС, дзе пратрымалі 2 гадзіны, а потым склалі пратакол.

Аднаго з апазыцыйных актывістаў - Васіля Палякова - у гэты ж дзень затрымалі на вуліцы, патрабавалі паказаць асабістыя рэчы, матывуючы тым, што шукаюць рабаўніка. У рэчах міліцыянты знайшлі газэты з заклікам да байкоту.

Таксама ў Гомелі і таксама ў гэты дзень (а 17.10) у кватэру да Віктара Карняенкі падманным чынам уварвалася шасьцёра міліцыянтаў. Спачатку яны чамусьці патрабавалі ў гаспадара паказаць газэту "Рэспубліка", а потым – "Рабочы", прычым дакумэнтаў на ператрус не паказалі. Таму сп. Карняенка папрасіў іх пакінуць кватэру. Узрушаны гэтай падзеяй, Карніенка напісаў заяву пракурору вобласьці.

### КЛЕЦАК

Агітацыя за байкот выбараў ідзе ў Клецку. Сябры БНФ ходзяць па кватэрах, раздаюць спэцвыпуск "Рабочага", наведваюць прадпрыемствы горада і інфармуюць працоўных пра выбарчы фарс 15 кастрычніка.

### СЬВЕТЛАГОРСК

Улады Сьветлагорскай арганізацыі БНФ распаўсюджваюць газэты, дзе асьвятляецца сучаснае становішча з т. зв. выбарамі і тлумачацца мэты гэтага фарсу. Актывістамі раздадзены шэраг газэтаў (13000 асобнікаў), налепкі.

Сябры БНФ зьбіраюцца правесьці мітынг 8 кастрычніка. Заяўку ў хуткім часе павінны разглядаць улады і даць адказ: дазваляецца ці не.

### БЕРАСЬЦЕ

20 верасьня на вуліцы Савецкай і ў раёне рынку адбыліся 2 сустрэчы з выбарнікамі. Сябры БНФ раздавалі спэцвыпуск газэты "Наша свабода" й агітавалі ня ўдзельнічаць у выбарчым фарсе. Па ўсёй Берасьцейскай зоне было распаўсюджана каля 30000 асобнікаў газэтаў. У адрозьненьне ад Менску, улады не выказвалі цікавасьці да акцыі сяброў БНФ.

Але Сержука Грыня, які расклейваў налепкі "Байкот-2000", затрымалі, пасьля чаго склалі пратакол.



### САЛІГОРСК

Старшыня Салігорскай арганізацыі БНФ Анатоль Лобан і адзін з грамадзкіх актывістаў Салігорску Аляксей Пятроў падалі заяўку на правядзеньне мітынгу 8 кастрычніка. Тэма, улічваючы тое, што на 15 кастрычніка прызначаныя выбары ў палату, будзе прысьвечана менавіта ім, а дакладней - байкоту выбараў. Лёзунг мітынгу гучыць так: "Дыктатура. Дэмакратыя. Выбары."

* * *

У Салігорску за некалькі дзён было распаўсюджана каля 7000 улётак. Аднак сябры БНФ прадчуваюць, што адказ гарадзкіх уладаў будзе адмоўным.

### РЭЧЫЦА

Рэчыцкая гарадзкая арганізацыя БНФ вырашыла больш актыўна правадзіць перадвыбарчую кампанію, таму была пададзена заява на правядзеньне ў горадзе свайго "Маршу Свабоды". Мітынг за байкот плянуецца на 8 кастрычніка. Заяўка пададзеная, але ўлады, зразумела, пакуль што маўчаць.

24 верасьня ў Рэчыцы адбылася сустрэча паміж сябрамі БНФ і АГП. Сабралася некалькі дзясяткаў чалавек, зь Менску быў Вячаслаў Сіўчык, з Гомля - Віктар Карніенка. Размова вялася пра самае актуальнае - кампанію «Байкот – 2000».

**Прэсавая група БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ**




## Суды

***25 верасьня ў судзе Партызанскага раёну г. Менску адбыўся працяг судовых разглядаў адміністраўыйных справаў над удзельнікамі сустрэчы з выбарнікамі, якая адбылася 21 верасьня на скрыжаваньні пр. Скарыны й вул. Казлова.***

У гэты дзень былі разгледжаныя адміністрацыйныя матэрыялы намесьніка Старшыні БНФ "Адраджэньне" Ю. Хадыкі, С. Рабкевіча, А. Рашэтнікавай і М. Раманава. Усе яны абвінавачваліся ў парушэньні арт. 167.3 КаАП РБ (парушэньне заканадаўства аб выбарах), а дакладней - у распаўсюджваньні спэцвыпускаў газэтаў "Рабочы" і "Народная воля", якія ўтрымлівалі заклікі да байкатаваньня выбараў. Падчас разгляду адміністрацыйнага матэрыялу адносна А.Рашэтнікавай, судзьдзя М. Трубнікаў прыйшоў да высновы, што ў яе дзеяньнях адсутнічае склад адміністрацыйнага правапарушэньня і вынес пастанову аб спыненьні справы, аднак у дзеяньнях наступнага "правапарушальніка" С. Рабкевіча, які разам з А. Рашэтнікавай трымаў плякат з надпісам "Сустрэча з выбарнікамі", ён угледзеў склад правапарушэньня й вынес пастанову аб накладаньні штрафу ў памеры 1 мінімальнага заробку. Адміністрацыйную справу адносна Ю. Хадыкі разглядала судзьдзя А. Дамінская, якая прызнала яго вінаватым і вынесла пастанову аб спагнаньні штрафу ў памеры 2 мінімальных заробкаў.

**Інфармацыйны аддзел ПЦ "Вясна"**



## 19 верасьня ў Празе адбыўся шэраг важных сустрэчаў афіцыйнага прадстаўніка БНФ "Адраджэньне"

***Натальля Маковік, афіцыйны прадстаўнік БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ у Чэхіі, правяла 19 верасьня шэраг сустрэчаў з прадстаўнікамі чэскіх уладаў.***

У прыватнасьці, прайшла сустрэча з Пэтрай Жыліновай - супрацоўніцай палітычнага аддзелу Адміністрацыі прэзыдэнта Чэхіі, якая адказвае за беларускі кірунак. Сп-ня Жылінова зазначыла, што прэзыдэнт Гавэл цьвёрда падтрымлівае імкненьне беларускага народу да дэмакратыі. Яна таксама запэўніла, што пытаньне аб парушэньні падставовых правоў і свабодаў чалавека ў Беларусі будзе абмяркоўвацца на ўсіх міжнародных сустрэчах.

Спадарыня Жылінова адзначыла, што афіцыйныя ўлады Чэхіі з трывогай сочаць за сыстэматычным ігнараваньнем Лукашэнкам правоў беларускіх грамадзянаў, таму падтрымліваюць ініцыятыву апазыцыі байкатаваць восеньскія парлямэнцкія выбары. "Наколькі гэта ў нашай кампэтэнцыі, мы будзем уплываць на МЗС ЧР, каб тыя не дасылалі назіральнікаў на 15 кастрычніка", - сказала прадстаўніца Адміністрацыі прэзыдэнта.

Вацлаў Гавэл рады, што ЧР працягвае традыцыю яшчэ першага чэхаславацкага прэзыдэнта Масарыка, які даваў магчымасьць маладым беларускім эмігрантам атрымліваць вышэйшую адукацыю. Так і з гэтага году 12 беларускіх студэнтаў, якія былі перасьледаваныя ў Беларусі за свае палітычныя погляды, прыехалі навучацца ў Чэхію. Спадарыня Жылінова запэўніла: "Мы заўсёды будзем падтрымліваць цесныя стасункі з дэмакратычнымі сіламі РБ".

У гэты ж дзень адбылася сустрэча Натальлі Маковік з сэнатарам Міхалам Жантоўскім, які зьяўляецца старшынём замежнай камісіі Сэнату. У размове сп. Жантоўскі выказаў непакой наконт масавых перасьледаў удзельнікаў кампаніі «Байкот – 2000» і паведаміў, што беларуская Амбасада ў Чэхіі зьвяртаецца да парлямэнтароў ЧР з заклікам прыехаць на выбары. Ён абвёрг інфармацыю аб тым што Чэхія, нібыта, дасылае назіральнікаў. Больш таго, на міжнародным роўні ЧР будзе выказвацца супраць прызнаньня вынікаў выбараў.

**Прэсавая група БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ**

vytoki.net

# ПАРЛЯМЭНТ І ВЫКАНАЎЧАЯ ЎЛАДА



Іван САВЕРЧАНКА, сябра Паліткамітэту

***Грамадзкі й палітычны крызыс у нашай краіне мае комплекс аб'ектыўных і суб'ектыўных чыньнікаў. Да ліку першых належаць, бадай, два: таталітарна-калаяніяльная мінуўшчына грамадзтва ды імпэрскія нэакаляніяльныя тэндэнцыі Масквы адносна Беларусі, што пачалі зноў выразна выяўляцца ў палітычнай тэорыі й практыцы Расеі. Галоўны сярод суб'ектыўных фактараў - недастаткова глыбокае разуменьне асноўнымі сацыяльнымі групамі й грамадзкімі сіламі прыроды сучаснай палітычнай сыстэмы, мэханізмаў яе эфэктыўнага функцыянаваньня на карысьць усёй супольнасьці, з-за чаго ў многім узьнік канфлікт і непаразуменьні.***

Мэта - максымальная эфэктыўнасьць улады

Дзеля выбару аптымальнага альгарытму дзеяньняў прынцыповае значэньне мае акрэсьленьне мэтаў, якія ставяцца асноўнымі суб'ектамі палітычнага працэсу. Нашае грамадзтва мае глыбокае і ўнівэрсальнае зацікаўленьне ў тым, каб у выніку пераўтварэньняў або ўдасканаленьня палітычнай архітэктуры краіны была дасягнутая наступная трыадзіная мэта: а) прадуктыўна працавала заканадаўчая галіна ўлады й яе найвышэйшы орган, выбраны народам; б) эфэктыўна функцыянавала моцная выканаўчая ўлада на чале з выбраным прэзыдэнтам і камандай яго аднадумцаў; в) дзейнічала дасканалая судовая сыстэма.

Грамадзтва мае патрэбу ў мабільнай, прафэсійнай і адказнай уладзе, кожная з трох галінаў якой мусіць бездакорна й высокатэхналягічна выконваць комплекс спэцыфічных функцыяў. Тэзы аб "слабой" выканаўчай уладзе, або, наадварот, "слабой" заканадаўчай уладзе - адпачатку непрадуктыўныя й гістарычна беспэрспэктыўныя. У дзяржаве павінны быць "моцнымі" ўсе тры галіны ўлады, што азначае высокапрафэсійнае выкананьне дзяржаўнымі органамі сацыяльных, эканамічных, палітычных функцыяў і задачаў, якія ўскладзеныя на іх грамадзтвам, часова праз выбарчыя мэханізмы даручаныя тым ці іншым палітычным групам. Тэарэтычна і практычна гэта цалкам магчыма, і больш за тое - выключна мэтазгодна й жыцьцёва неабходна. У цяперашні ж час мы маем дэкаратыўны парлямэнт і насамрэч надзвычай слабую выканаўчую ўладу, хоць існуе міт пра яе неверагодную моц. Заробак кіраўніка вышэйшага рангу, міністра, складае блізу 100 USD, што ставіць нават яго перад неабходнасьцю залазіць у дзяржаўную кішэню або трапляць у павуціньне карупцыі. Гэта найбольш яскравае сьведчаньне слабасьці, а дакладней - поўнай бездапаможнасьці выканаўчай сыстэмы.

Крайнасьці й аднабаковасьці, як бачна, не вядуць грамадзтва да посьпеху, яны недапушчальныя, бо за імі - крызыс і заняпад. Устанаўленьне вінаватага ў гэткім становішчы, аналіз прычынаў - рэч патрэбная, але маласуцяшальная.

Агульная задача палягае ў тым, каб стала падтрымліваць балянс уладаў, а натуральныя супярэчнасьці і "антаганізм" паміж імі - ператвараць у крыніцу пазытыўнай, стваральнай энэргіі, скіраванай на дасягненьне агульнанацыянальных інтарэсаў.

Выбар прыймальнай мадэлі

Выбар мадэлі і структуры вышэйшай заканадаўчай улады шчыльна лучыцца з разуменьнем прынцыпаў і мэханізмаў ўзаемадзеяньня зь іншымі галінамі ўлады. У розных дэмакратычных краінах гэтая праблема мае адмысловае разьвязаньне.

Сучасная паліталягічная тэорыя ведае два тыпы дэмакратыі, крытэрам якіх зьяўляецца спосаб выбару кіраўніка выканаўчай улады.

Першы тып - кіраўнік выканаўчай улады выбіраецца бальшынёй заканадаўцаў. У выніку рэалізацыі такой мадэлі ўсталёўваецца дэмакратычны парлямэнцкі рэжым. Часам гэты канцэптуальны падыход называюць "мадэль Ўэстмінстэра". Пры абсалютным выяўленьні акрэсьленага падыходу ў краіне функцыянуе сыстэма аднапартыйнай урадавай адказнасьці.

Другі тып дэмакратыі - выбар кіраўніка выканаўчай улады праз усеагульнае галасаваньне, што прыводзіць да ўсталяваньня і функцыянаваньня ў краіне прэзыдэнцкага рэжыму. Прэзыдэнт, які атрымаў перамогу на выбарах, фармуе выканаўчую ўладу, якая ажыцьцяўляе нутраную й вонкавую палітыку.

У тэарэтычным і гісторыка-практычным аспэктах абодва тыпы дэмакратыі пацьвердзілі сваю жыцьцяздольнасьць. Кожны народ мае права аддаць перавагу той ці іншай форме дэмакратычнага ладу.

Карані палітычнага крызысу ў нашай краіне палягаюць у тым, што пры ажыцьцяўленьні канстытуцыйных зьменаў 1994 г. былі захаваныя толькі фармальныя абрысы мадэлі прэзыдэнцкага тыпу дэмакратыі, скарыстаная вонкавая схема, а не яе зьместавае напаўненьне. Пры ўвасабленьні й функцыянаваньні прэзыдэнцкага рэжыму ў нашай краіне парушаныя ўсе ключавыя, сыстэмныя кампанэнты дэмакратыі - асабліва ў частцы падзелу ўлады на тры яе незалежныя галіны, а таксама справядлівага правядзеньня выбараў, сумленнага падліку галасоў, доступу да СМІ ды інш. Пасьля дзяржаўнага перавароту ўвосень 1996 г. у краіне наагул усталяваўся аўтарытарны рэжым, Парлямэнт набыў дэкаратыўныя рысы.

Шляхі й мэханізмы пераадоленьня крызысу

Ключавая задача аналітыкі - прапанаваць набор найбольш прыдатных інструмэнтаў, існуючых у палітычнай тэорыі й практыцы, або акрэсьліць іх камбінаваныя формы, а таксама мэханізмы й схемы, парадак і ўмовы іх выкарыстаньня, з дапамогай якіх можна было б без сацыяльных забурэньняў і "рэвалюцыі" вывесьці Беларусь з канстытуцыйнага тупіку, вярнуць краіну на шлях законнасьці, дэмакратыі й захаваньня правоў чалавека.

У чыстым выглядзе можна вылучыць, бадай, дзьве лягічныя схемы, два варыянты паводзінаў і дзеяньняў.

Першы варыянт. Ён грунтуецца на прызнаньні таго, што парлямэнцкі лад - меньш небясьпечны для новаўтвораных дэмакратыяў і ў гістарычным пляне найбольш пэрспэктыўны. Пры нязьменнасьці такой фундамэнтальнай пазыцыі эфэктыўнымі кампанэнтамі дасягненьня мэты выступаюць: а) перацягненьне на свой бок абалютнай бальшыні грамадзтва; б) скліканьне на заключным этапе Ўсебеларускага зьезду, або Кангрэсу дэмакратычных сілаў, які выканае функцыю Канстытуцыйнага сходу. Бяз дзьвюх названых абавязковых складнікаў задача застанецца нявырашанай. Гэтая схема найбольш надзейная й пэрспэктыўная, але яна вымагае неверагодных арганізацыйных высілкаў, маштабнай асьветніцкай, адукацыйнай і інфармацыйнай працы, рэалізацыі мноства гуманітарных праектаў, перадусім, кадравых рэсурсаў. Паліталягічная тэорыя, да таго ж, ня ведае ўсіх аспэктаў, усіх складанасьцяў пераходу ад прэзыдэнцкай мадэлі да парлямэнцкай дэмак-


vytoki.net

ратыі. Нягледзячы на ўсе акалічнасьці, нашае грамадзтва мусіць скіроўваць львіную долю высілкаў на ўвасабленьне акурат гэтае схемы. Важнейшы арганізацыйны вынік рэалізацыі першага варыянту - пераход статусу кіраўніка дзяржавы да старшыні Парлямэнту.

Другі варыянт. Ён базуецца на папярэдняй згодзе аб функцыянаваньні ў нашай краіне прэзыдэнцкага рэжыму з наступным яго кардынальным зьместавым удасканаленьнем. Гэтая "рэформа рэжыму" ўлучае мноства складовых.

Да ліку найважнейшых належыць стварэньне перадумоваў пачатку "рэформаў". Яны ўключаюць: а) грамадзкія пратэсты супраць рэжыму; б) скаардынаваную падтрымку міжнароднай супольнасьці. Пры адсутнасьці крытычнай масы кожнага з названых чыньнікаў "рэформа" не пачнецца. Істотным зьвяном зьяўляецца пазыцыя Расеі, якая да апошняга часу нязьменна падтрымлівала нутраную й вонкавую палітыку агентаў сваіх спэцслужбаў у Беларусі, якімі, што ўжо агульнавядома, зьяўляюцца А.Г. і ягонае найбліжэйшае атачэньне ў Парлямэнце і ва Ўрадзе.

Калі будуць выкананыя перадумовы і пачнуцца спробы "рэфармаваньня" прэзыдэнцкага рэжыму ў Беларусі, то перад удзельнікамі працэсу непазьбежна паўстане комплекс праблемаў, якія палягаюць, прынамсі, у пяці сфэрах.

Першая сфэра - удасканаленьне выбарчага заканадаўства. Ключавое значэньне тут маюць некалькі кампанэнтаў: а) ўвядзеньне прапарцыйна-мажарытарнага прынцыпу выбару дэпутатаў; б) фармаваньне выбарчых камісіяў, у тым ліку і ЦВК, з удзелам апазыцыі; в) свабодны доступ прадстаўнікоў апазыцыі да дзяржаўных СМІ; г) стварэньне ўмоваў для бесьперашкодных сустрэчаў кандыдатаў у дэпутаты з выбарнікамі; д) спыненьне перасьледаў за палітычную дзейнасьць.

Другая сфэра - рэальны аб'ём паўнамоцтваў Парлямэнту. Прыярытэтны кірунак - ператварэньне трыбуны Парлямэнту ў сапраўдны форум для распрацоўкі й абмеркаваньня стратэгіі разьвіцьця краіны, усіх ключавых складовых нутраной і вонкавай палітыкі дзяржавы. Надзвычайную важнасьць мае пашырэньне функцыяў кантролю Парлямэнту за дзяржаўнымі інстытутамі і наагул усёй выканаўчай уладай. Істотнае значэньне набывае пытаньне ўплыву Парлямэнту на выканаўчую ўладу. У першую чаргу лягічна паўстане пытаньне аб праве Парлямэнту, з выразна акрэсьленымі мэханізмамі, заслухоўваць даклады й справаздачы прадстаўнікоў выканаўчай улады, найперш прэзыдэнта і міністраў - аб іх праграмах, дзеяньнях, праводзімай палітыцы. Наступны элемэнт - рэальная магчымасьць ствараць спэцкамісіі і праводзіць расьследваньне дзейнасьці прэзыдэнта ды іншых найвышэйшых службовых асобаў. Найважнейшая задача - дамагчыся таго, каб за Парлямэнтам было замацавана права прызначаць старшыню Нацыянальнага Банку. Кантрольныя функцыі Парлямэнту істотна пашырыліся б пры пераходзе да яго права прызначэньня старшыні Дзяржаўнага кантролю і Генэральнага пракурора. Прынцыпова важна, каб прызначэньне прэзыдэнтам прэм'ер-міністра і Кабінэта Міністраў адбывалася выключна пасьля ўзгадненьня з вышэйшым заканадаўчым органам. У выніку, былі б у найбольшай ступені дасягнутыя неабходныя для грамадзтва стабільнасьць і выверанасьць нутраной і вонкавай палітыкі дзяржавы.

Трэцяя сфэра - комплекс пытаньняў, зьвязаных з фармаваньнем эфэктыўнай структуры Парлямэнту. Як паказвае сусьветная парлямэнцкая практыка, вышэйшы заканадаўчы орган паводле будовы можа быць аднапалатным ці дзьвюхпалатным. Калі ў краіне прымаецца і рэалізуецца ідэя дзьвюхпалатнага парлямэнту, то яна абавязкова прадугледжвае, што ўсе чальцы Верхняй палаты (Сэнату, Савета Рэспублікі) прайшлі працэдуру выбараў на рэгіянальным роўні - выбраныя на пасады кіраўнікоў рэгіёнаў. Гэта дае ім права ўваходзіць у склад Верхняй палаты паводле пасады, на якую яны абраныя народам у часе выбараў мясцовай выканаўчай улады. Такім чынам забясьпечваецца непасрэднае ўзаемадзеяньне заканадаўчай і выканаўчай уладаў. Пры гэтым застаецца непарушным прынцып разьдзяленьня ўладаў, бо ў заканадаўчым органе няма палітыкаў, прызначаных вышэйшай службовай асобай краіны, кіраўніком выканаўчай улады.

Чацьвертая сфэра - магчымасьць пераходу да публічнай заканадаўчай дыскусіі - тэле-і радыётрансьляцыі парлямэнцкіх паседжаньняў, што дае магчымасьць для выяўленьня палітычнага таленту кожнага з парлямэнтароў і мае выключнае агульнаграмадзкае значэньне. Заканадаўчая дыскусія дазваляе: а) пашырыць інфармацыйную аснову прыняцьця рашэньняў, што надзвычай істотна пры фармулёўцы канцэпцый і праграмаў; б) істотна стымулюе пазытыўныя дзеяньні выканаўчай улады, як у апэратыўным так і канцэптуальна-стратэгічным аспэктах; в) стрымлівае выканаўчую ўладу - прэзыдэнта, міністраў, судзьдзяў - ад магчымых злоўжываньняў, адхіленьняў ад заканадаўства, перавышэньня службовых паўнамоцтваў ды інш.

Пятая сфэра - узаемадзеяньне галінаў улады. Тут, дарэчы, ўжо ёсьць нацыянальны досьвед. Дзейнасьць Вярхоўнага Савету 12 і часткова 13 скліканьня паказала, што Ўрад, паралізаваны непрафэсійным Парлямэнтам, ня можа эфэктыўна выконваць ускладзеныя на яго грамадзтвам функцыі. Таксама пэрыяд "прэзыдэнцкага кіраваньня", асабліва пасьля восеньскага "выбуху" 1996 г. яскрава засьведчыў, што выканаўчая ўлада, пазбаўленая парлямэнцкага кантролю, непазьбежна ўсталёўвае ў краіне дыктатуру й пачынае тэрарызаваць грамадзтва. Арганізацыйнай формай узаемадзеяньня выканаўчай і заканадаўчай галінаў улады, напэўна, магла б стаць на пераходны пэрыяд праца створаных "Двухбаковых камісіяў", дзейнасьць якіх рэглямэнтавалася б спэцыяльным Палажэньнем ці законам.



*Палата прадстаўнікоў*



vytoki.net

**Камэнтар**

## Вінцук Вячорка: "Лукашэнка таксама праводзіць паралелі з рэжымам Мілошавіча"

*На выбарах у Сэрбіі перамог апазыцыйны кандыдат Ваіслаў Каштуніца. Незалежныя і міжнародныя арганізацыі сьцьвярджаюць, што Каштуніца перамог ужо ў першым туры. У той жа час, афіцыйны цэнтарвыбаркам падае звесткі, паводле якіх усё ж такі мусіць адбыцца другі тур выбараў. Як бы там ні было, сытуацыя і ў самой Югаславіі, і ўвогуле, у Эўропе, моцна зьмянілася. Што ж югаслаўскія падзеі могуць значыць для Беларусі? Па камэнтар мы зьвярнуліся да Старшыні БНФ Вінцука Вячоркі:*

– Бясспрэчна, мы думаем пра беларускія інтарэсы і праводзім паралелі між падзеямі ў Сэрбіі і ў Беларусі. У інтарэсах Беларусі - эфэктыўная й хуткая перамога антымілошавіцкіх сілаў. Яна будзе сыгналам - ня столькі самому Лукашэнку, колькі той частцы ягонай вэртыкальнай сыстэмы ўлады, якая здольная думаць пра сваю ўласную будучыню. Калі Цэнтральная выбарчая камісія, падкантрольная Мілошавічу, змушаная пагадзіцца з тым, што Каштуніца набраў болей галасоў, ясна, што працэс "здачы" Мілошавіча пачаўся. Ягоная намэнклятура пачала яго здаваць. І гэта ёсьць падказка для беларускай намэнклятуры, для вэртыкальнай сыстэмы ўлады, для беларускага генэралітэту усіх сілавых структураў. Бясспрэчна, яшчэ можа здарыцца ўсякае. Мілошавіч, як і Лукашэнка, ня мысьліць сябе па-за ўладай. Ён можа паспрабаваць штучна абвастрыць сытуацыю ў краіне, справакаваць канфлікты, крызыс і ўжыць сілу для затушэньня супраціву. І многае будзе залежаць ад скаардынаванай і разумнай дзейнасьці дэмакратычнай кааліцыі, аб'яднаньнем якой мы можам толькі цешыцца. Тыя з антымілошавіцкіх сілаў, якія не аб'ядналіся, пацярпелі паразу і цяпер сыходзяць у адстаўку (я маю на ўвазе ў першую чаргу Драшкавіча).

Рэакцыя афіцыйнай беларускай прапаганду на выніке выбараў у Сэрбіі паказвае, што лукашэнкаўскі рэжым таксама праводзіць паралелі і баіцца за сваю шкуру: пасьля краху рэжыму Мілошавіча Беларусь застаецца адзінай чорнай дзіркай на мапе Цэнтальна-Ўсходняй Эўропы. Цяпер увага цывілізаванага сьвету будзе скіраваная на Беларусь. Перамога над Мілошавічам надае імпэту перад Маршам Свабоды, яна пацьвярджае слушна выбраную намі стратэгію на аб'яднаньне апазыцыі, на змаганьне за рэальную ўладу на прэзыдэнцкіх выбарах, пацьвярджае магчымасьць выбраць кампрамісную фігуру на кандыдата ў прэзыдэнты і эфэктыўна правесьці прапагандовую кампанію за яго на працягу 3-х месяцаў.

**Замежжа**

# Югаслаўскае люстэрка для Беларусі: выбары як выбар

***Да апошняга часу ў Югаславіі быў папулярны такі жарт: у Мілошавіча чатыры апірышчы - яго партыя, фінансавыя крыніцы, дзяржаўныя мэдыі разам са спэцслужбамі і ... апазыцыя. Так, нярэдка сэрбская апазыцыя сваёй разьяднанасьцю, памылкамі, гатоўнасьцю некаторых вядомых лідэраў прымаць з рук Мілошавіча ўладныя партфэлі дапамагала дыктатару высклізаць зь вельмі непрыемных сытуацыяў. Але сёньня пра чатыры апірышчы казаць ужо немагчыма.***



У жніўні апазыцыя зрабіла вельмі дакладны выбар. Таксама, зразумела, не бяз цяжкасьцяў. Шматлікія невялічкія апазыцыйныя партыі так і ня здолелі дамовіцца з найбуйнейшым Сэрбскім Рухам Адраджэньня. Харызматычны лідэр Руху Драшкавіч паставіў умову: ці ён адзіны кандадат у прэзыдэнты ад апазыцыі, ці адзінай апазыцыі на выбарах ня будзе. Астатнія партыі не пагадзіліся рабіць стаўку на непрадказальнага Драшкавіча і поўнага адзінства так і не атрымалася.

Сэрбскія дэмакраты прапаноўвалі стаць адзіным кандыдатам апазыцыі нават чарнагорскаму прэзыдэнту Джуканавічу. Пры ягонай згодзе сэрбская апазыцыя атрымлівала двайны выйгрыш: удзел Чарнагорыі ў выбарах і моцнага кандадата. Але Джуканавіч аддаў перавагу Чарнагорыі і байкоту.

І ўсе ж 18 сэрбскіх апазыцыйных партыяў здолелі стварыць агульны перадвыбарчы блёк і вылучыць агульным кандыдатам у прэзыдэнты лідэра невялічкай Дэмакратычнай партыі Сэрбіі, прафэсара канстытуцыйнага права Бялградзкага ўнівэрсытэту Ваіслава Каштуніцу. І адбыўся ў пэўным сэнсе электаральны цуд. Учора яшчэ далёка ня самы папулярны палітык у краіне за лічаныя тыдні паводле папулярнасьці пакінуў далёка ззаду ўсіх астатніх уключна з Мілошавічам.

Чаму мы гаворым пра цуд? Справа ў тым, што ўзьлёт Каштуніцы не ўкладаецца ў традыцыйныя сцэнары. Ён - не "чалавек ніадкуль", у югаслаўскай палітыцы ён - з канца 80-х гадоў, а ў пэўным сэнсе з 74-га году, калі за крытыкуЦіта яго звольнілі з унівэрсытэту. Але Каштуніца ўвесь час быў дзеячом "другога эшалёну". Нельга растлумачыць яго ўзьлёт і нейкім "гучным", папулярным учынкам, кшталту якога-небудзь антыкарупцыйнага дакладу ці адстаўкі. У адстаўку, дарэчы, яму не было адкуль сыходзіць. У адрозьненьне ад іншых апазыцыянэраў, Каштуніца прынцыпова ніколі не супрацоўнічаў з рэжымам. Але ў апошнія гады ён не вылучаўся і нейкімі надта празаходніцкімі заявамі і дзеяньнямі.

Зразумела, адным з чыньнікаў раптам узьніклай папулярнасьці Каштуніцы зьяўляецца дастаткова нізкая папулярнасьць Мілошавіча.

Праграма дэмакратычных пераўтварэньняў, што прапануе блёк на чале з Каштуніцам, утрымлівае даволі стандартны набор мераў дэмакратызацыі і эканамічных рэформаў. Да асаблівасьцяў перадвыбарчай плятформы можна аднесьці абяцаньне Каштуніцы, што ў выпадку яго абраньня праз год ён правядзе датэрміновыя, цалкам свабодныя прэзыдэнцкія выбары.

Вось цытата зь ягонага перадвыбарчага выступу: "Людзі прыходзяць да мяне й кажуць: выратуй нас. Усе ведаюць, што калі Мілошавіч застанецца ва ўладзе, у іх жыцьці нічога ня зьменіцца. ...Я меркаваў, што Мілошавіч усё дакладна пралічыў. Але зараз я думаю, што ён пралічыўся: я ўпэўнены, што ён не чакаў майго зьяўленьня на палітычнай арэне".


vytoki.net

Але, магчыма, галоўнае, на што зьвяртаюць увагу ўсе наглядальнікі - гэта вельмі крытычнае стаўленьне кандыдата дэмакратычнай апазыцыі да Захаду, у прыватнасьці, да Амэрыкі. Ён кажа, што падыходы як Амэрыкі, гэтак і Мілошавіча - гэта "пятля на шыі Сэрбіі". Напачатку перадвыбарчай кампаніі Каштуніца заявіў, што для перамогі яму не патрэбы ў амэрыканскай дапамозе, ён кажа, што калі стане прэзыдэнтам, не аддасьць Мілошавіча трыбуналу ААН па вайсковых злачынствах, бо, паводле меркаваньня Каштуніцы, гэта - амэрыканская ўстанова.



*Прыхільнікі Мілошавіча сьцьвярджалі спачатку, што наперадзе ён*

Адмыслоўцы кажуць, што Каштуніца заўсёды быў памяркоўным сэрбскім нацыяналістам. Хаця памяркоўнасьць ацэньваецца па-рознаму: напрыклад, прыхільнікі незалежнасьці Чарнагорыі лічаць, што няма асаблівай розьніцы паміж Каштуніцам і сэрбскім ультранацыяналістам, лідэрам Радыкальнай партыі Шэшалем.

Вось яшчэ некаторыя цытаты з перадвыбарчых інтэрвію Каштуніцы апошніх тыдняў: "Вялікая схільнасьць часткі посткамуністычнага сьвету лічыць, што ўсе рашэньні прымаюцца на Захадзе, як нядаўна лічылі, што гадзіньнік трэба спраўджваць па крамлёўскім часе. У Вашынгтоне хочуць атрымаць кантроль і над астатняй тэрыторыяй Сэрбіі, апроч Косава, а атрымаецца гэта з Мілошавічам ці безь яго - ім гэта ўсё роўна".

Варта адзначыць, што стаўленьне Каштуніцы да Эўропы такое ён абяцае вярнуць Югаславію ў Эўропу, але не ахвяруючы нацыянальнымі інтарэсамі.

Паколькі апазыцыя перастала быць "хлопчыкам для біцьця", асаблівую ўвагу Мілошавіч падаваў выкарыстаньню адміністрацыйнага рэсурсу. Мэтады гэтыя амаль аднолькавыя паўсюль. Менавіта ў гэтым годзе 10 тысячаў маладых сем'яў атрымлівающь кватэры. Напярэдадні выбараў узмацніўся ціск на незалежныя мэдыі: улада ўзяла пад свой кантроль папулярную незалежную радыёстанцыю і сталічную тэлестудыю, якую кантралявала апазыцыя. Незалежных журналістаў запалохваюць і перасьледуюць - некалькі месяцаў таму ваенны суд прыгаварыў журналіста Філіпавіча да 7 гадоў зьняволеньня за "шпіянаж". "Шпіянаж" палягаў у рэпартажах Філіпавіча пра тое, што рабіла югаслаўскае войска ў Касове да прыходу туды міратворцаў НАТО.

У апошнія месяцы адбылася сэрыя нападаў на актывістаў апазыцыйнага студэнцкага руху "Отпор" - "Супраціў": то паліцыя рабіла перат-русы ў офісе "Отпору", то невядомыя асобы жорстка зьбівалі актывістаў Руху. Некалькі месяцаў таму ізноў жа невядомыя зрабілі замах на жыцьцё аднаго з лідэраў апазыцыі Драшкавіча, а ў мінулым месяцы загадкава зьнік былы кіраўнік камуністычнай Сэрбіі, крытык Мілошавіча Стамболіч. Паводле сьцьверджаньняў улады, яна, зразумела, ня мае да гэтых інцыдэнтаў ніякага дачыненьня.



*27 верасьня на галоўным пляцы Белграду 200000 прыхільнікаў Каштуніцы сьвяткавалі перамогу на выбарах*

Дзякуючы таму, што апазыцыя мае фракцыю ў парлямэнце і моцныя пазыцыі ў мясцовай уладзе ў буйных гарадох, яна мае і сваіх прадстаўнікоў у выбарчых камісіях. Амаль паўсюль, акрамя Касова і паўднёвых раёнаў Сэрбіі, што мяжуюць з Касовам. Гэта фактычна прыфрантавая паласа, дзе пануе войска, а значыць - Мілошавіч. Колькасьць сэрбскіх уцекачоў з Касова ніхто ня ведае, тым больш няма і іх дакладнага сьпісу. Апазыцыя лічыць, што менавіта на поўдні будуць найбольш маштабныя фальсыфікацыі вынікаў выбараў.

На што ж спадзяецца апазыцыя? Доступу да дзяржаўных мэдыяў яна ня мае, штаб Каштуніцы абраў тактыку перадвыбарчай кампаніі "ад дзьвераў да дзьвераў": агітатары ходзяць па кватэрах і пераконваюць людзей.

У рэшце рэшт і партапарат, і чынавенства, і вой ска - часткі грамадзтва. Калі яны адчуюць, што перамога на баку Каштуніцы, ён сапраўды пераможа, у тым ліку і дзякуючы іх паводзінам.

**Паводле Радыё Свабода**

## *Вынікі прэзыдэнцкіх выбараў у Югаславіі паводле Цэнтру за свабодныя і дэмакратычныя выбары*




Калі рыхтаваўся нумар, сталі вядомыя афіцыйныя вынікі прэзыдэнцкіх выбараў у Саюзнай Рэспубліцы Югаславія.

Паводле прамілошавіцкага цэнтарвыбаркаму, дэмакратычны кандыдат Ваіслаў Каштуніца набраў 48 % галасоў сэрбскіх выбарнікаў, а цяперашні прэзыдэнт Мілошавіч – 41 %

vytoki.net

## Фронт дапамог тым, хто патрабуе

***У Бабруйску з 31 жніўня па 15 верасьня была праведзена дабрачынная акцыя "Дары садоў - ад чыстага сэрца - хворым і тым хто адчувае патрэбу" Яна прайшла пад лёзунгам «Падзяліся з тым хто мае патрэбу – і Бог дасьць табе».***

Ініцыятарамі акцыі былі: Бабруйская філія Беларускай асацыяцыі ахвяраў палітычных рэпрэсіяў, БНФ "Адраджэньне" г. Бабруйска, Беларускі фонд Касіяпэя, Бабруйская гарадзкая філія партыі Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада.

У выніку гэтай акцыі была сабраная вялікая колькасьць яблыкаў, грушаў, чорнай рабіны, сьліваў. Валанцёры наведалі з садавінай усе палаты адзьлеўньня гарадзкой больніцы, сухотнай больніцы, школы № 9, дзіцячага дому № 1, прытулак для дзяцей.

Для гатаваньня кампотаў садавіна была дастаўлена таксама ў дом грудного дзіцяці, інтэрнат № 2, дзіцячы дом.

Забясьпечылі садавінай хворых старых і самотных людзей, якіх абслугоўвае ў хаце аддзел сацыяльнай абароны Першамайскага раёну г. Бабруйска.

Мы выйшлі з прапановай у аддзел сацыяльнай абароны Ленінскага раёну г. Бабруйску з прапановай забясьпечыць грамадзян гэтага раёна садавінай. У бліжэйшыя дні адрасаты (680 чалавек) атрымаюць яблыкі.

Мы таксама прапанавалі атрымаць садавіну і дзіцячай працоўнай калёніі Бабруйска.

**Сяргей ШЭНДЗЕРАЎ**

## ПЁТРА САДОЎСКІ

*Сябра Сойму БНФ, старшыня міжнароднай камісіі*



*Нарадзіўся 2 лютага 1941 г. у вёсцы Будзькаўшчына Полацкага раёну Віцебскай вобласьці. Пасьля заканчэньня Менскай Сувораўскай вайсковай вучэльні ў 1959 г. да 1964 г. вывучаў германістыку й гішпаністыку ў Менскім інстытуце замежных моваў (зараз Лінгвістычны ўнівэрсытэт).*

*1964 - 1972 выкладчык нямецкай, гішпанскай мовы ў МДзПІЗМ. Студэнт-карэспандэнт Маскоўскага інстытута патэнтазнаўства, інжынэр-патэнтазнаўца Менскага мотавелазаводу.*

*1973 - 1989 Навуковы супрацоўнік Інстытута мовазнаўства АН БССР (білінгвізм, экспэрымэнтальная фанэтыка) у сапрацоўніцтве зь Ленінградзкім інстытутам далёкай сувязі. У 1977 годзе абараніў кандыдацкую дысэртацыю (блізкароднасны білінгвізм, фанэтыка - акустычнае дасьледаваньне). Дацэнт Менскага пэдагагічнага інстытуту, аўтар падручнікаў, артыкулаў з культуры мовы, курсаў удасканаленьня для журналістаў.*

*1990 - 1992 Дэпутаат Вярхоўнага Савету БССР, старшыня Камісіі ў замежных справах і зьнешнеэканамічных сувязях.*

*1992 - 1994 Надзвычайны й Паўнамоцны Амбасадар Рэспублікі Беларусь у ФРГ.*

*З1995 вольны журналіст, супрацоўнік прыватных фірмаў, "Прыёрбанку", віцэ - прэзыдэнт НА "Клюб Бон - Менск", сябра рэдкалегіі часопісу "Wostok" (Кёльн).*

Сваю заяву на ўступленьне ў Партыю БНФ Вы можаце дасылаць на адрас:
**220005, г. Менск, вул. Варвашэні, 8,**
**Управа Сойму Партыі БНФ**

**Ва Ўправу Сойму Партыі БНФ Грамадзяніна Беларусі**

_______________________________
(прозьвішча)

_______________________________
(імя)

_______________________________
(імя па бацьку)

**які нарадзіўся «___» _______________ 19__ г**

**жыве па адрасе:** _______________________
(індэкс і поўны адрас)

_______________________________

**род заняткаў:** _______________________

**тэл.** _______________________

**ЗАЯВА**

**Прашу прыняць мяне ў Партыю БНФ. Праграмныя палажэньні БНФ «Адраджэньне» падзяляю. Абавязуюся выконваць Статут Партыі БНФ.**

_____________ (дата) _____________ (подпіс)

Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
Fond 1/12 sprava H15

НавінЫ
БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТУ "АДРАДЖЭНЬНЕ"
№ 9 (26), верасень 2000 г, наклад 299 асобнікаў
Распаўсюджваецца бясплатна на правах нут-

У нумары скарыстаная выява Пагоні з тытульнага аркуша Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г.
Адрас для ліставаньня: 220006, Менск, а/с 27, тэл. 284-50-12
E-mail: bnf@journalist.com
в.а. рэдактара Віктар Івашкевіч
У нумары выкарыстаныя фатаздымкі Irex/ProMedia

vytoki.net